**ДЭРМАТАЛОГІЯ** (грэч. dérma скура+ +...*логія*), навука пра скуру. Падзяляецца на агульную і прыватную. Агульная вывучае марфалогію, фізіялогію і біяхімію скуры, заканамернасці развіцця скурных хвароб, прынцыпы іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі, прыватная — асобныя скурныя хваробы. Звязана з венералогіяй, педыятрыяй, акушэрствам, хірургіяй, неўрапаталогіяй.

Навук. Д. ўзнікла ў 2-й пал. 18 ст., калі была распрацавана марфалагічная класіфікацыя хвароб скуры (аўстр. вучоныя І. І. Пленк, Ф. Гебра і англічанін Р. Уілен). У Расіі кафедра скурных хвароб адкрыта ў 1869 пры медыка-хірург. акадэміі ў Пецярбурзе. На чале яе стаяў А. Г. Палацебнаў, які заснаваў фізіял. кірунак у Д. і адкрыў (з В. А. Манасеіным) лекавыя якасці зялёнай плесні (гл. *Пеніцылін*). Вялікі ўклад у развіццё Д. зрабілі рус. вучоныя: Ц. П. Паўлаў развіў ідэі нервізму ў Д., А. І. Паспелаў распрацаваў методыку касметычнага масажу, лячэнне саркомы прэпаратамі мыш'яку, П. В. Нікольскі — фенамен адслойвання эпідэрмісу пры лістападобнай пузырчатцы. Сав. практычная і навук. Д. дасягнула значных поспехаў у барацьбе з туберкулёзам скуры (В. М. Падвысоцкая, А. С. Сахноўская), лепрай (В. І. Кедроўскі, М. А. Тарсуян і інш.), гнайнічковымі (С. Л. Багроў, М. С. Смелаў, М. Ц. Брыль, М. П. Батунін), грыбковымі (М. А. Чарнагубаў, А. М. Арыевіч) і прафес. хваробамі (У. І. Іваноў, М. П. Батунін, А. П. Даўганаў) і інш.

У БССР распрацаваны метады лячэння чырвонай ваўчанкі акрыхінам і некаторых інш. хвароб скуры ультрагукам, даследаваны ўплыў рэнтгенаўскіх прамянёў і ультрагуку на хваробы скуры і абмен рэчываў пры дэрматозах (А. Я. Пракапчук, Л. І. Багдановіч, Л. І. Гакінаева). У СССР працуе Усесаюзнае т-ва дэрмата-венеролагаў, якое кіруе дзейнасцю рэсп. т-ваў.

Выдаюцца часопісы: «Вестник дерматологии и венерологии» (СССР), «The Journal of investigative Dermatology» («Часопіс па навуковай дэрматалогіі», ЗША), «Annales de Dermatologie etde Syphiligraphie» («Аналы па дэрматалогіі і сіфіліграфіі», Францыя), «Dermatologische Monatsschrift» («Дэрматалагічны штомесячнік», ГДР), «Československa dermatologie» («Дэрматалогія Чэхаславакіі», ЧССР).

*Літ.*: История медицины СССР, М., 1964 (бібліягр.); Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967; Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958). Указатель литературы, Мн., 1961; гл. таксама літ. пры арт. *Венералогія*.

*Л. І. Багдановіч*. Віцебск.

**ДЭРМАТОЗЫ** (грэч. dérma скура), вынікі, прыроджаныя і набытыя паталагічныя працэсы ў скуры і яе прыдатках (валасах, пазногцях). Выклікаюцца экзагеннымі прычынамі (хім., мех., біял.) і эндагеннымі (агульныя інфекцыйныя хваробы, ачаговыя інфекцыі, інтаксікацыі), парушэннямі абмену рэчываў, рэактыўнасцю арганізма, нястачай вітамінаў. Д. паражаюць увесь арганізм або асобныя органы і сістэмы. Лячэнне агульнае (прычыннае) і мясцовае (сімптаматычнае).

*Літ.*: Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967; Павлов С. Т. Кожные и венерические болезни, Л., 1969. *А. П. Комаў*. Мінск.

**ДЭРМАТЫТ** (грэч. dérma скура), запаленне скуры. Бывае 2 відаў: просты — ад дзеяння на скуру пэўных раздражняльнікаў (механічных — доўгае трэнне, біялагічных — кляшчы, тэмпературных — апёкі, абмаражэнні, хімічных — к-ты, шчолачы, прамянёвых — сонечныя прамяні, радыяцыя) і алергічны — паяўляецца ад паўторных уздзеянняў раздражняльнікаў [некат. фарбы (урсол), медыкаменты (сульфаніламіды, парамінабензойная к-та), пральныя парашкі], якія выклікалі сенсібілізацыю арганізма. Прыкметы Д.: пачырваненне, прыпухласць, пухіры, боль, сверб, пякота. Лячэнне: ліквідацыя прычын, што выклікалі хваробу, мясцова — процізапаленчыя сродкі.

*Літ.*: Гл. пры арт. *Дэрматозы*. *А. П. Комаў*. Мінск.

**ДЭРЫВАЦЫЯ** (лац. derivatio адвядзенне, адхіленне), 1) у гідратэхніцы — сукупнасць абходных вадаводаў, па якіх вада адводзіцца з ракі ці вадаёма для суднаходства, энергетыкі або ірыгацыі.

Д. суднаходная — кароткі канал з адным ці некалькімі шлюзамі; робіцца для абходу парогаў, плацін. Д. энергетычная — абходныя тунелі, трубаправоды, каналы. Будуецца з нахілам значна меншым за нахіл ракі (каб атрымаць у канцы Д. напор вады, які выкарыстоўваецца ў дэрывацыйных ГЭС; гл. *Гідраэлектрычная станцыя*). Такая Д. бывае напорнай, калі паверхня вады непасрэдна не сутыкаецца з атмасферай (тунелі, трубаправоды), і безнапорнай (каналы).

2) У балістыцы — адхіленне артылерыйскага снарада (кулі) ад плоскасці стральбы; узнікае з прычыны іх вярчэння.

*Літ.*: Использование водной энергии, ч. 3, М.— Л., 1965; гл. таксама літ. пры арт. *Балістыка*.

**ДЭРЫК**, дэрык-кран (англ. derrick), грузападымальны стралавы кран з апорнай паваротнай мачтай, размацаванай падкосамі ці расцяжкамі (вантамі). Гл. *Кран падымальны*.

**ДЭРЭГУС** Міхаіл Гардзеевіч [н. 22.11(5.12). 1904, сяло Вясёлае Харкаўскага пав.], украінскі савецкі графік і жываніссц. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1958). Чл. КПСС з 1951. Вучыўся ў Харкаўскім маст. ін-це (1923—30). Работы ў графіцы: іл. да твораў Т. Шаўчэнкі («Кацярына», 1939, 1956), М. Гогаля («Вечары на хутары каля Дзіканькі», 1950, «Тарас Бульба», 1952, 1956), серыя «Украінскія нар. думы і гістарычныя песні» (1947—57) і інш.; у жывапісе: «Трыпольская трагедыя» (1935), «Пераяслаўская рада» (1952, з С. Рэпіным і В. Савенкавым), «Дума пра казака Галоту» (1960) і інш. Узнаг. ордэнам Леніна.

*Літ.*: Михаил Гордеевич Дерегус, М., 1954.

**ДЭСАНТ** (франц. descente апусканне, высадка), войскі, прызначаныя для высадкі або высаджаныя на занятую ворагам тэрыторыю для баявых дзеянняў. Паводле мэты, задач і складу войск бывае тактычны, аператыўны і стратэгічны, паводле спосабу дастаўкі — паветраны, марскі і камбінаваны.

**ДЭ САНТЫС** (De Santis) Джузепе (н. 11.2. 1917, г. Фонды), італьянскі кінарэжысёр. Адзін з заснавальнікаў *неарэалізму*. Чл. ІКП. У 1943—45 удзельнік Супраціўлення. Фільмы: «Трагічнае паляванне» (пастаўлены на сродкі Нац. асацыяцыі партызанаў Італіі, прэмія 8-га Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі, 1947), «Горкі рыс» (1949), «Няма міру пад алівамі» (1950), «Рым, 11 гадзін» (1952), «Яны ішлі на ўсход» (1962—64, з сав. кінематографістамі) і інш.

*Літ.*: Кацев И. Джузеппе Де Сантис, М., 1965.